# ДА ЮБІЛЕЮ ЧАСОПІСА «ВЕСНІК БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»

УДК 347.781.52(476)БГУКИ

*В. М. Сакалова*

## Дваццацігоддзе навукова-метадычнага часопіса «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў»: 2002–2022

*Артыкул прысвечаны гісторыі і традыцыям выдання навукова-метадычнага часопіса «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў»: людзям, якія стаялі ля вытокаў яго стварэння, аўтарам, што развіваюць навуку, рэдактарам, якія кожны дзень карпатліва працуюць на карысць чытачоў.*

*Часопіс працягвае і развівае лепшыя традыцыі айчыннай культуры і сёння стаіць у шэрагу найбольш вядомых і аўтарытэтных беларускіх перыядычных выданняў па гуманітарных навуках.*

***Ключавыя словы:*** *«Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў», перыядычнае навукова-метадычнае выданне, гісторыя і традыцыі развіцця, актуальныя матэрыялы, культурнае і навуковае супрацоўніцтва.*

*V. Sokolova*

## Twentieth anniversary of the scientific and methodical magazine "Herald of the Belarusian State University of Culture and Arts": 2002–2022

*The article is dedicated to the history and traditions of publishing the scientific-methodical magazine "Herald of the Belarusian State University of Culture and Arts": to the people who were at the origins of its creation, to the authors who develop science, to the editors who work hard every day for the benefit of the readers.*

*The magazine continues and develops the best traditions of national culture and it is now one of the most famous and authoritative Belarusian editions in the humanities.*

***Key words:*** *"Herald of the Belarusian State University of Culture and Arts", periodical scientific and methodological publication, history and traditions of development, topical materials, cultural and scientific cooperation.*

У кастрычніку 2002 г. пабачыў свет першы нумар навукова-метадычнага часопіса «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў» – люстэрка навуковага жыцця нашага ўніверсітэта.

З гэтага часу «Веснік» сістэматычна знаёміць чытача з важнейшымі дасягненнямі ў галінах культуралогіі, мастацтвазнаўства, бібліятэказнаўства, сацыяльна-культурнай дзейнасці, музеязнаўства, дае магчымасць навукоўцам і выкладчыкам іншых установ выказаць свае меркаванні аб сучасных тэндэнцыях у развіцці беларускай культуры.

Узровень матэрыялаў, разнастайнасць тэм і прадстаўленых аўтарскіх пазіцый высока ацэнены навуковым супольніцтвам: у 2003 г. часопіс быў уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, што дазволіла рэпрэзентаваць актуальныя матэрыялы, якія маюць навукова-тэарэтычную, метадалагічную і практычную каштоўнасць.

Ля вытокаў стварэння часопіса стаялі доктар педагагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі Ядвіга Дамінікаўна Грыгаровіч (1946–2011), рэктар універсітэта ў 1992–2007 гг. і доктар гістарычных навук, прафесар Марыя Аркадзьеўна Бяспалая (1948–2021), прарэктар па навуковай працы ў 2001–2008 гг. – падзвіжнікі ў гуманітарнай галіне.





Апошні артыкул Марыі Аркадзьеўны «Патрыятычныя маршыпесні “Развітанне славянкі” і “Свяшчэнная вайна” як сімвалічнае адлюстраванне сацыякультурнай дынамікі грамадства» быў апублікаваны, калі яна ўжо пайшла з жыцця, ён стаў развітальным і таму найбольш каштоўным, як сімвалічная вестка ў «Веснік».

Марыя Аркадзьеўна была пастаянным аўтарам часопіса на працягу ўсяго яго існавання, уваходзіла ў навуковы савет, рабіла адбор артыкулаў для раздзела «Музеязнаўства», клапацілася аб якасці і дакладнасці матэрыялаў, да апошніх сваіх дзён укладала ў часопіс веды, жыццё і душу.

Сярод аўтараў першага нумара часопіса прадстаўнікі розных напрамкаў гуманітарнай навукі, сёння вядомыя вучоныя – доктар гістарычных навук прафесар Марыя Аркадзьеўна Бяспалая, доктар мастацтвазнаўства прафесар Вера Паўлаўна Пракапцова, доктар культуралогіі прафесар Аляксандр Іванавіч Смолік, доктар педагагічных навук прафесар Васіль Емяльянавіч Лявончыкаў, доктар педагагічных навук прафесар Раман Сцяпанавіч Матульскі, доктар мастацтвазнаўства прафесар Наталля Паўлаўна Яканюк, доктар мастацтвазнаўства прафесар Рыгор Фёдаравіч Шаура, доктар філалагічных навук прафесар Аляксандр Уладзіміравіч Марозаў, доктар педагагічных навук прафесар Віктар Мікалаевіч Наумчык, доктар мастацтвазнаўства прафесар Аляксандр Іванавіч Смагін, кандыдат філасофскіх навук, прафесар, акадэмік Беларускай акадэміі сацыяльных навук Аляксандр Васільевіч Бадакоў, кандыдат педагагічных навук дацэнт Людміла Іванаўна Казлоўская, кандыдат педагагічных навук дацэнт Мікалай Аляксандравіч Яцэвіч, кандыдат педагагічных навук прафесар Лілія Адамаўна Дзямешка, кандыдат гістарычных навук Людміла Міхайлаўна Рагачова, кандыдат мастацтвазнаўства Вольга Алегаўна Грачова, кандыдат педагагічных навук дацэнт Мікалай Мікалаевіч Каралёў, кандыдат тэхнічных навук дацэнт Аляксей Генадзьевіч Бураўкін, кандыдат культуралогіі дацэнт Ігар Леанідавіч Коган.

Першапачатковы дызайн вокладкі часопіса распрацавала беларускі мастак, дацэнт Лада Сяргееўна Шчасная.

Сённяшнія поспехі і дасягненні абапіраюцца на шматгадовую плённую працу вучоных БДУКМ. Беларускі эстэтык, філосаф, культуролаг, кандыдат філалагічных навук, доктар філасофскіх навук, прафесар Мікалай Ігнатавіч Крукоўскі, філосаф, культуролаг, даследчык беларускага фальклору, доктар філасофскіх навук, прафесар Энгельс Канстанцінавіч Дарашэвіч, старшыня навуковага савета часопіса, доктар культуралогіі, прафесар Аляксандр Іванавіч Смолік, артыстка балета і пісьменнік, доктар мастацтвазнаўства, прафесар Юлія Міхайлаўна Чурко, доктар гістарычных навук прафесар Павел Іванавіч Бондар і іншыя выдатныя навукоўцы, што друкаваліся на старонках

часопіса, прынеслі ўніверсітэту прызнанне як даследчага цэнтра беларускай навукі.

Значны ўнёсак у развіццё нацыянальнай навукі зрабілі навукова-даследчыя школы БДУКМ, чые дасягненні неаднаразова знаходзілі ўвасабленне ў артыкулах часопіса: у галіне тэорыі, методыкі і арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці (заснавальнікі – доктар педагагічных навук прафесар Я. Д. Грыгаровіч, кандыдат педагагічных навук дацэнт Л. І. Казлоўская, з 2013 г. сукіраўніком з'яўляецца доктар педагагічных навук дацэнт І. А. Малахава); тэорыі і гісторыі мастацтва, кампаратыўнага мастацтвазнаўства (заснавальнік – доктар мастацтвазнаўства прафесар В. П. Пракапцова); бібліятэказнаўства, кнігазнаўства і бібліяграфазнаўства (заснавальнік – доктар педагагічных навук прафесар В. Е. Лявончыкаў); тэорыі і гісторыі культуры (заснавальнікі – кандыдат гістарычных навук прафесар П. Р. Ігнатовіч, доктар філасофскіх навук прафесар М. І. Крукоўскі, доктар культуралогіі прафесар А. І. Смолік, доктар філасофскіх навук прафесар М. А. Мажэйка); тэорыі і практыкі музейнай справы (заснавальнікі – доктар гістарычных навук прафесар М. А. Бяспалая, доктар гістарычных навук прафесар А. А. Гужалоўскі).

Несумнеўнымі добрымі якасцямі часопіса з'яўляюцца высокі тэарэтычны ўзровень публікуемых матэрыялаў, вастрыня пастаноўкі праблем, адкрытасць і шчырасць пунктаў гледжання аўтараў артыкулаў.

Аўтары часопіса не толькі сусветна вядомыя навукоўцы, такія як доктар псіхалагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь Якаў Львовіч Каламінскі, хабілітаваны доктар кнігазнаўства прафесар Кшыштаў Мігань, мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча, народны артыст БССР, прафесар Міхаіл Паўлавіч Дрынеўскі, музыказнавец, аўтар прац па пытаннях тэатральнай музыкі, сучаснага музычнага мастацтва, доктар мастацтвазнаўства Надзея Аляксандраўна Юўчанка, даследчык гісторыі беларускага мастацтва, доктар мастацтвазнаўства, прафесар Надзея Фёдараўна Высоцкая, але і практыкі – архітэктар, даследчык архітэктурнай спадчыны Беларусі, кандыдат архітэктуры Вячаслаў Міхайлавіч Чарнатаў, кандыдат культуралогіі, дацэнт, дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка Тамара Аляксандраўна Джумантаева, археолаг, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Алег Анатольевіч Трусаў, кінарэжысёр заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Вячаслаў Аляксандравіч

Нікіфараў, кандыдат мастацтвазнаўства, дырэктар дырэкцыі канала «Культура» генеральнага прадзюсарскага цэнтра Беларускага радыё (Белтэлерадыёкампанія) Уладзімір Анатольевіч Трапянок і многія іншыя.

Публікацыі ў часопісе адзначаны высокай якасцю, фундаментальнасцю выкладання матэрыялу, глыбінёй асэнсавання праблем развіцця беларускай культуры. «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў» – надзейны памочнік у навуковай дзейнасці аспірантаў, спрыяе станаўленню новых пакаленняў спецыялістаў сферы культуры. Многія даследчыкі, якія публікавалі артыкулы ў часопісе, паспяхова абаранілі дысертацыі.

Апублікавацца ў «Весніку Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў» стала прэстыжным для многіх навукоўцаў у сферы сацыяльна-гуманітарных ведаў.

Адным з паказчыкаў прызнання навуковай грамадскасцю аўтарытэтнасці выдання з'яўляецца геаграфія аўтараў часопіса. Сёння аўтарская і чытацкая аўдыторыя часопіса вымяраецца тысячамі ўважлівых і ўдзячных чытачоў не толькі ў Беларусі, але і іншых краінах свету. За дваццаць мінулых гадоў з упэўненасцю можна сказаць, што ў ім прадстаўлены ўсе беларускія навуковыя цэнтры. Сярод публікацый артыкулы даследчыкаў з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, устаноў НАН Беларусі (Інстытута філасофіі, Інстытута гісторыі, Інстытута сацыялогіі, Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры), Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, Нацыянальнага гісторыка-

культурнага музея-запаведніка «Нясвіж», Музея «Замкавы комплекс “Мір”»; навукоўцаў з Расіі (Маскоўскага дзяржаўнага інстытута культуры, Інстытута гісторыі Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта, Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта прамысловых тэхналогій і дызайну, Расійскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя А. І. Герцэна, Расійскай акадэміі музыкі імя Гнесіных, Вяцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Уральскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта), Украіны (Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Кіеўскага дзяржаўнага інстытута дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і дызайну імя М. Байчука, Харкаўскай акадэміі дызайну і мастацтваў, Харкаўскага нацыянальнага педагагічнага ўніверсітэта імя Р. С. Скаварады, Прыкарпацкага нацыянальнага ўніверсітэта імя Васіля Стэфаніка, Ровенскага дзяржаўнага гуманітарнага ўніверсітэта, Усходнееўрапейскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Лесі Украінкі), Кітайскай Народнай Рэспублікі (Кітайскага навукова-інжынернага інстытута правінцыі Цзянсу, Універсітэта Кайлі, Універсітэта Байса, Універсітэта г. Наньян правінцыі Хэнань, Маньянскага педагагічнага ўніверсітэта, Хэнаньскага політэхнічнага ўніверсітэта і інш.), Казахстана (Жэтысускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя І. Жансугурава, Казахскага нацыянальнага ўніверсітэта мастацтваў), Дзяржаўнага інстытута мастацтваў і культуры Узбекістана, Вроцлаўскага ўніверсітэта (Рэспубліка Польшча). Часопіс садзейнічае і будзе садзейнічаць далейшаму плённаму супрацоўніцтву, духоўнаму ўзаемаўзбагачэнню.

Па выніках апытання (2,3 тыс. вядучых вучоных, якія ўдзельнічаюць у рабоце сістэмы падрыхтоўкі і атэстацыі навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі), якое было праведзена ў 2015 г. Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь з мэтай ацэнкі ўзроўню навуковых артыкулаў у выданнях, уключаных у Пералік, «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў» займае трэцюю пазіцыю па напрамку «мастацтвазнаўства і культуралогія». Такім чынам, ён аднесены да навуковых выданняў, найбольш аўтарытэтных у навуковым асяроддзі, якія ўзначальваюць спісы ў галіне гуманітарных і сацыяльна-палітычных навук. Гэта адзначана ў рашэнні калегіі Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 11 снежня 2015 г. № 19/1.

З 2002 г. па 2004 г. часопіс выдаецца раз у год, з 2005 г. па 2018 г. – 2 разы на год, з 2019 г. – 4 выпускі.

Поспех часопіса – вынік велізарных намаганняў аўтараў і супрацоўнікаў аддзела рэдакцыйна-выдавецкай і паліграфічнай работы БДУКМ. Над ім працуюць людзі, якія ўдасканальваюць часопіс сваімі ведамі, намаганнямі, прафесійнасцю, з упартасцю, дастойнай павагі.



З 2002 г. над часопісам працавалі загадчык рэдакцыйнага аддзела ў 1993–2010 гг. Людміла Ціханаўна Спірыдонава (1937–2020) і рэдактар у 1995–2011 гг. Іна Васільеўна Смяян, якая з 1972 г. па 1992 г. загадвала рэдакцыяй літаратуры па філалогіі, журналістыцы, педагогіцы выдавецтва «Універсітэцкае». З 2008 г. да сумеснай працы над часопісам далучаецца рэдактар Валянціна Васільеўна Каташвілі, у паслужным спіску якой рэдагаванне навуковай, вучэбнай літаратуры па філалогіі, гісторыі ў выдавецтве «Універсітэцкае», узначальванне рэдакцыі афіцыйнага нарматыўна-прававога выдання «Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь», рэдакцыі часопіса «Вестник по налогам и сборам Республики Беларусь».

З 2009 г. рэдагаваннем артыкулаў займаецца кандыдат культуралогіі, дацэнт, дактарант кафедры культуралогіі БДУКМ Вольга Міхайлаўна Сакалова, якая ўзначаліла аддзел у 2010 г. У 2018 г. да працы над часопісам далучылася вядучы рэдактар Тамара Уладзіміраўна Люковіч, якая працавала навуковым рэдактарам у выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя

імя Петруся Броўкі», рэдактарам вучэбнай, метадычнай літаратуры па філалогіі, гісторыі, матэматыцы ў выдавецтве «Народная асвета».

Тэхнічнае рэдагаванне часопіса ажыццяўляюць з 2002 г. па 2006 г. – Людміла Мікалаеўна Мельнік, з 2007 г. – Аляксандра Уладзіміраўна Гіцкая. З 2007 г. карэктуру вычытвае Вераніка Браніславаўна Кудласевіч, якая працяглы час працавала на Беларускім тэлебачанні, з'яўлялася аўтарам, рэдактарам і вядучай праграмы «Творцы». Паліграфічная якасць друку – заслуга вядучага спецыяліста Дзмітрыя Аляксандравіча Ісаева, спецыяліста па аператыўнай паліграфіі Паўла Якаўлевіча Кухто, тэхніка Ларысы Віктараўны Смышляевай.

Дзякуй за Вашу высакародную працу! Жадаю ўсім, хто мае дачыненне да часопіса, цікавых публікацый, творчых поспехаў і выдавецкага даўгалецця!

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 19.09.2022.